УДК 94:332.54(476.6)

# АДУКАЦЫЯ СУПРАЦОЎНІКАЎ ДЭПАРТАМЕНТА ЗЕМЛЯРОБСТВА ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ (ПА СТАНЕ НА 1915 Г.)

**Галубовіч В.У., Радзюк А.Г.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На пачатку XX ст. у Гарадзенскай губерні адчуваўся недахоп спецыялістаў у галіне сельскай гаспадаркі. Адсутнасць магчымасці атрымаць адукацыю на месцы рабіў губерню залежнай ад цэнтраў падрыхтоўкі кадраў, стрымліваў гаспадарчае развіццё рэгіёна. Становішча пачало змяняцца толькі ў другім дзесяцігоддзі XX ст., калі ў Гарадзенскай губерні з'явіліся першыя навучальныя ўстановы адпаведнага профілю: Краснастоцкая жаночая вучэльня (1911 г.), прыватная сельскагаспадарчая вучэльня ў Гародні (1914 г.) і дзяржаўная Азярніцкая пачатковая школа (1913 г.) [1, с. 345]. Але выправіць агульнае становішча гэтыя школы не здолелі з прычыны вельмі кароткага тэрміну іх дзейнасці. Таму ў губерні адчувалася патрэба не толькі ў спецыялістах з вышэйшай аграрнай адукацыяй, але былі запатрабаваныя выпускнікі самых розных сельскагаспадарчых устаноў. Вельмі добра гэта відаць на прыкладзе Дэпартамента Земляробства Гарадзенскай губерні.

Звесткі пра адукацыю супрацоўнікаў Дэпартамента былі складзеныя ўрадавым аграномам Антонам Савічам Елянеўскім у 1915 г. у сувязі з эвакуацыяй губернскіх устаноў у Калугу [4, арк. 159-159 адв., 163-164].

Сярод службоўцаў Дэпартамента асобы з вышэйшай адукацыяй складалі нязначны адсотак. Выпускніком універсітэта (праўда, не вядома якога) быў малодшы спецыяліст па садаводстве Павел Васілевіч Катовіч. З ліпеня 1915 г. у Дэпартаменце пачаў працу майстрам палявых работ Іосіф Вацлававіч Янкоўскі, які скончыў Вышэйшую сельскагаспадарчую акадэмію ў Дублянах (Галіцыя). У НГАБ (г. Гародня) нават захавалася пасведчанне, выдадзенае 10 кастрычніка 1883 г. Іосіфу Міхалу Янкоўскаму (1858 г. нараджэння, родам з Любак у Люблінскім ваяводстве), аб сканчэнні ім "на дастатковым узроўні" Краёвай вышэйшай сельскагаспадарчай школы ў Дублянах па курсу сельскай гаспадаркі, жывёлагадоўлі, адміністрацыі і пісьмовай падрыхтоўцы ды бездакорнай абароне праекта арганізацыі зямянскага маёнтка [4, арк. 22 адв.]. Янкоўскі І. меў вялікі вопыт дзейнасці ў галіне сельскай гаспадаркі: працаваў касірам маёнтка

(1889-1891 гг.), упраўляючым рознымі маёнткамі (1891-1894 гг., 1894-1896 гг., 1896-1898 гг., 1898-1902 гг.), загадчыкам Гарохаўскага сельскагаспадарчага склада (1912-1914 гг.) і з 1914 г. ізноў касірам-бухгалтарам маёнтка Паазёры [3, арк. 31-31 адв.].

Паводле звестак урадавага агранома А.С. Еляпеўскага, сярэднюю сельскагаспадарчую адукацыю меў старэйшы інструктар па культуры балотаў і лугаводстве І.С. Кірухін, які праслухаў курсы па лугаводстве і культуры балот пры Маскоўскім сельскагаспадарчым інстытуце ў 1911 г., прайшоў практыку ў Прыбалтыцы і Фінляндыі ў 1913 г. і служыў інструктарам па лугаводству пры Тульскай губернскай землеўпарадкавальнай камісіі ў якасці агранома ў Багародзіцкім і Яфрэмаўскім паветах [2, арк. 329]. Падобную кваліфікацыю, напэўна, меў і малодшы інструктар па паляводстве Мікалай Пятровіч Уласаў, які скончыў невядомыя "сярэднія сельскагаспадарчыя курсы".

Большая ж частка служачых Дэпартамента атрымала толькі ніжэйшую сельскагаспадарчую адукацыю. Да ліку такіх адносіліся Сямён Паўлавіч Паўлаў, Фёдар Мітрафанавіч Казінец, Васіль Аўраамавіч Берней, Рыгор Севярынавіч Рудскі, Іван Дзям'янавіч Марчышын, Казімір Антонавіч Лункевіч, Рыгор Антонавіч Лінавіцкі, Васіль Іванавіч Клапцоў, Яфім Дзям'янавіч Ануфрыенка, Іван Максімавіч Барушка.

Акрамя таго, у ліку супрацоўнікаў Дэпартамента былі практыканты па садаводстве, выпускнікі ніжэйшых школ садаводаў: Аляксей Пятровіч Князеў, Фёдар Міхайлавіч Шавель, Васіль Гаўрылавіч Мішчанка.

Усе супрацоўнікі, пра якіх вядома месца атрымання адукацыі, навучаліся не ў Гарадзенскай губерні. Выпускнікамі Белакрыніцкай сельскагаспадарчай школы былі В.А. Берней і І.М. Барушка [4, арк. 208; 2, арк. 91]. Вольнанаймальны майстар па лугаводстве Р.А. Лінавіцкі скончыў Залатаношскую сельскагаспадарчую школу і Наўгародскія курсы па лугаводстве і культуры балотаў [4, арк. 178]. Майстар па лугаводстве В.І. Клапцоў атрымаў адукацыю ў Лужаснянскай сельскагаспадарчай школе [4, арк. 177]. Слухачом Кіеўскіх сельскагаспадарчых курсаў і Менскіх курсаў па лугаводстве і культуры балотаў быў Я.Д. Ануфрыенка [4, арк. 209]. Майстар па паляводстве А.П. Уласаў прайшоў падрыхтоўку на Петраградскіх сельскагаспадарчых курсах [4, арк. 159-159 адв.]. У Сабешынскай сельскагаспадарчай школе вучыўся, але не скончыў яе з-за вайны прыняты на працу ў Дэпартамент у ліпені 1915 г. К.А. Лункевіч [4, спр. 25, арк. 16-16 адв, 21-21 адв.]. Практыкант В.Г. Мішчанка скончыў Палтаўскае вучылішча садаводаў [4, арк. 82], а часова наняты

з 1 чэрвеня 1915 г. на пасаду тэхніка па садаводстве ў Ваўкавыскім пітомніку Ф.М. Шавель быў выпускніком Петраградскай школы садаводства [2, арк. 400-400 адв.].

Акрамя гэтых звестак, захавалася яшчэ інфармацыя пра супрацоўніка Дэпартамента майстра А. Балашова, якога мабілізавалі ў армію на пачатку 1915 г.: ён меў пасведчанне ад 28 траўня 1914 г. аб сканчэнні курсаў па культуры балотаў і лугаводстве ў Ноўгарадзе [2, арк. 3-5].

Узровень падрыхтоўкі тагачасных супрацоўнікаў быў прыблізна аднолькавым, што відаць па іх пасведчаннях аб адукацыі. Напрыклад, захаваўся атэстат выпускніка Белакрыніцкай казённай ніжэйшай сельскагаспадарчай школы першага разраду імя А.Ф. Вароніна Галоўнай Управы земляробства і землекарыстання В.А. Бернея, які навучаўся там з 8 студзеня 1911 г. да 1914 г. Адзнакі Васіля Аўраамавіча па агульнаадукацыйных прадметах былі не высокія, пераважна задавальняючыя, г.зн. 3 па арыфметыцы, расейскай мове, расейскай гісторыі, геаметрыі, фізіцы, батаніцы, заалогіі, хіміі, лесаводстве, каморніцтве, чарчэнні, сельскагаспадарчым правазнаўстве. Крыху вышэй, г. зн., 3 ½ па Законе Божым, геаграфіі, хмелеводстве, арганізацыі гаспадаркі і рахункаводстве, добра (4) па земляробстве, жывёлагадоўлі, агародніцтве, 4 ½ па садаводстве. Практыку вучань прайшоў на выдатна па ўсіх накірунках выпрабаванняў: жывелагадоўлі, малочнай гаспадарцы, агародніцтве, хмеляводстве, метэаралогіі і хатняй гаспадарцы [4, арк. 66-66 адв.]. Як відаць, практычная накіраванасць дамінавала ў асобе вучня.

Звольнены ўвесну 1915 г. вольнанаймальны майстар па паляводству Адам Іванавіч Паціюк таксама з'яўляўся гадаванцам Белакрыніцкай сельскагаспадарчай школы, дзе навучаўся з 8 студзеня 1911 г. да сканчэння поўнага курса ў 1914 г. Паводле захаванага пасведчання поспехі ў школе А.І. Паціюк меў наступныя: 4½ па Законе Божым, жывёлагадоўлі, хмелеводстве; добра (4) па расейскай гісторыі, батаніцы, заалогіі, лесаводстве, садаводстве, агародніцтве, каморніцтве, чарчэнні, рахункаводстве, арганізацыі гаспадаркі, сельскагаспадарчым правазнаўстве; 3 па расейскай мове, 3 ½ па арыфметыцы, геаграфіі, геаметрыі, фізіцы, хіміі, земляробстве. Практыку вучань прайшоў на выдатна па ўсіх накірунках выпрабаванняў: земляробстве, жывелагадоўлі, малочнай гаспадарцы, агародніцтве і садаводстве, хмеляводстве, метэаралогіі і хатняй гаспадарцы [3, арк. 2-2 адв.]. З гэтага ж дакумента, пасведчання, вынікае, што быў ён сынам селяніна, праваслаўнага веравызнання, нарадзіўся 24 красавіка 1895 г. Цікава, што па сканчэнні школы

выдавалі пасведчанне, як у выпадку Пацеюка, і толькі пасля адбыцця гадавой практыкі ў прыватнай гаспадарцы і падрыхтоўкі задавальняючай справаздачы пасведчанне замянялася на атэстат [3, арк. 2-3].

Захавалася таксама копія атэстата, выдадзенага В.І. Клапцову Педагагічнай радай Лужаснянскай ніжэйшай сельскагаспадарчай вучэльні, якая сведчыць, што Клапцоў вучыўся тут з 1909 г. да 1912 г. Адзнакі па агульнаадукацыйных прадметах ён меў вельмі добрыя – 4 ½, па асноўных прыродазнаўчых навуках вельмі добрыя – 4 ½, па сельскай гаспадарцы і яе галінах (земляробстве з травасеяннем, агародніцтве, садаводстве з хмеляводствам, жывёлагадоўлі з малочнай гаспадаркай, пчалярстве і лесаводстве) ды па тэорыі вельмі добрыя – 4 ½, а па практыцы і рамёствам выдатныя (5). У атэстаце было адзначана, што "за увесь час знаходжання ў вучэльні паводзіны былі выдатныя (5)", таму Педагагічная рада 3 верасня 1912 г. выдала яму атэстат з усімі правамі, дадзенымі "Вышэй зацьверджаным" 26 траўня 1904 г. "Палажэннем аб сельскагаспадарчай адукацыі". Паводле артыкула 54 гэтага "Палажэння", выпускнікі школы ў адносінах вайсковай службы маглі карыстацца правамі выпускнікоў курсаў другога разраду, а паводле 53 артыкула, пасля 5 год выдатных паводзінаў і працы ў сельскай гаспадарцы па прадстаўленні Міністра Земляробства і Дзяржмаёмасці яны маглі атрымаць званне "асабістага шаноўнага грамадзяніна, калі не маюць, паводле паходжання, правоў вышэйшага стану". Дарэчы, у атэстаце адзначана, што Клапцоў быў праваслаўнага веравызнання, паходзіў з сялянаў і на 1912 г. меў 22 гады. Выдадзены дакумент быў 13 верасня 1912 г. [3, арк. 11-11 адв.]

Такім чынам, адукацыя супрацоўнікаў Дэпартамента Земляробства дазваляла ім выконваць свае прафесійныя абавязкі. Службоўцаў з вышэйшай кваліфікацыяй сярод іх было мала. Пераважную большасць супрацоўнікаў складалі несямейныя маладыя людзі. Вельмі стракатай быў штат паводле месца навучання. Цяжка сказаць на колькі атрыманыя некаторымі супрацоўнікамі далёка ад Беларусі веды можна было з поспехам выкарыстоўваць у Гарадзенскай губерні.

**КРЫНІЦЫ**

1. Казарезов В.В. Петровская (Тимирязевская) академия: Московский сельскохозяйственный институт (1894-1917 гг.): исторический очерк. Т. 3. М., 2009.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 20.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 24.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 25.